Education and Culture DG

Culture Programme

Education, Audiovisual & Culture Executive Agency

show Belarus show Europe

**Прэс-канферэнцыя з нагоды пачатку еўрапейскай культурнай кампаніі "Адкрывай Беларусь – Адкрывай Еўропу"**

3 сакавіка 2011 года ў Мінску адбудзецца афіцыйная прэс-канференцыя, прысвечаная пачатку еўрапейскай культурнай кампаніі “Адкрывай Беларусь – Адкрывай Еўропу”. Кампанія з’яўляецца сумеснай для Беларусі і 5-ці краін Еўрапейскага Саюза – Германіі, Літвы, Эстоніі, Швецыі і Партугаліі. Яна скіравана на развіццё супрацоўніцтва паміж арт-коламі Беларусі і Еўрапейскага Саюза і стварэнне адзінай еўрапейскай творчай прасторы, дзе ўсе ахвотныя змогуць свабодна знаёміцца з сучаснай культурай і мастацтвам еўрапейскіх краін. Кампанія рэалізуецца пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага Саюза.

Падчас двухгадовай кампаніі сучасную культуру Беларусі і 5-ці ўзгаданых еўрапейскіх краін прадставяць каля 70 музыкаў, мастакоў і фатографаў на канцэртах, выставах і майстар-класах, якія адбудуцца ў Дрэздэне, Вільнюсе, Лісабоне, Тарту, Стакгольме, Мінску, Нясвіжы, Полацку, Бабруйску, Рэчыцы і Пінску.

Падчас афіцыйнай прэс-канференцыі журналістам і ўдзельнікам будуць падрабязна прадстаўлены тры этапы кампаніі, умовы адбору ўдзельнікаў, каманда арганізатараў і іншыя дэталі.

**Месца правядзення прэс-канферэнцыі: канферэнц-зала гатэля “Еўропа” (г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 28). Пачатак: 14.00.**

*Па пытаннях звяртайцеся, калі ласка, да каардынатараў праграмы Аляксандра Апейкіна, тэл. +375292552362, альбо Яўгена Прэйгермана, тэл. +375295168505.*